нормативистским и «широким» подходом к праву. Но спор, в сущности, был не об объеме его понятия. Попытки некоторых авторов осудить нормативизм в праве не могли быть успешными, потому что право, как бы мы его ни понимали, в каких бы терминах ни определяли, всегда и неизменно нормативно. Полагаем, что любая концепция, игнорирующая это обстоятельство, ущербна.

Последующие периоды характеризуются поворотом к неосталинизму, усилением кризиса советской социалистической системы (1966–1985 гг.); нарастанием застойных явлений в политической, экономической и социальной сферах, кризисом и распадом СССР (вторая половина 80-х – начало 90-х гг.). С демократизацией жизни общества, формированием многопартийной системы, переходом к рыночным отношениям, суверенизацией бывших советских республик поиск нового правопонимания продолжается.

Уделяя особое внимание периодизации Советского государства, мы исходим из того, что нельзя рассматривать историю развития науки о праве в отрыве от истории развития науки о государстве. Дело в том, что государство и право – две неразрывно связанные между собой части юридической действительности, их исторические судьбы неразрывны. Можно сказать, что они возникают одновременно, в результате одних и тех же причин, развиваются взаимозависимо и выполняют единые политические, экономические, социальные и другие функции. Государство не может выполнять свое социальное назначение без того, чтобы не предписывать в нормативной форме индивидам, государственным органам, различным организациям определенное поведение, не обеспечивать использование юридических прав и исполнение обязанностей. В то же время право связывает государственные органы конституционными и иными нормами, упорядочивает их деятельность, вводит их в законное русло. Если исходить из вышеизложенного постулата и соблюдать принцип историзма, то ретроспективный анализ типов правосознания следует увязывать с периодизацией того или другого государственно-организованного общества, используя как формационный, так и цивилизационный подходы. Полагаем, что оба подхода должны не противопоставляться, а дополнять друг друга.

Говоря о периодизации, можно утверждать, что она является одновременно и принципом, и методом, и логическим итогом познания процесса становления и развития правосознания в политико-правовой мысли. Периодизация необходима при систематизации идей, взглядов, учений о правосознании, выделении ведущих научных школ, что не только облегчает изучение предмета, но и дает ориентиры для дальнейшего осмысления и углубления знаний по рассматриваемой проблеме.



**Список использованных источников**

1. Послание Конституционного Суда Республики Беларусь Президенту Республики Беларусь, Палате представителей и Совету Республики Беларусь Национального собрания Республики Беларусь «О состоянии конституционной законности в Республике Беларусь в 2017 году» // Вестн. Конституц. Суда Респ. Беларусь. – 2018. – № 1. – С. 35–62.

2. Вишневский, А.Ф. Общая теория государства и права : учебник / А.Ф. Вишневский, Н.А. Горбаток, В.А. Кучинский. – Пересмотр. 3-е изд. ; под общ. ред. проф. В.А. Кучинского. – Минск : Акад. МВД, 2017. – 478 с.

3. Буклова, З.К. Исторические этапы развития (становления) российского правосознания и его особенности / З.К. Буклова // Право и политика. – 2009. – № 7. – С. 1524–1529.

4. Ефременко, Е.М. Правосознание учащейся молодежи / Е.М. Ефременко. – Минск : Акад. МВД, 2012. – 119 с.

5. Юрашевич, Н.М. Правосознание белорусского общества : монография / Н.М. Юрашевич. – Минск : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2006. – 165 с.

УДК 34(09)(476)

*І.А. Саракавік*

## УПЛЫЎ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НА АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ЮРЫДЫЧНАЙ НАВУКІ БЕЛАРУСІ Ў 1940–1960-х гг.

З вызваленнем Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Савецкая ўлада адразу ж пачала аднаўленне органаў улады і кіравання, усіх сфер жыццядзейнасці, у тым ліку юрыдычнай навукі і адукацыі. Аднаўленне, а таксама страты ў вайне мільёнаў савецкіх людзей патрабавалі падрыхтоўкі новых высокакваліфікаваных спецыялістаў. Асаблівая ўвага была нададзена падрыхтоўцы юрыстаў.

Яшчэ прадаўжалася Другая сусветная вайна, але 29 верасня 1944 г. згодна з распараджэннем СНК СССР № 19238-р, а таксама аб'яднаным загадам Усесаюзнага камітэта па справах вышэйшай школы пры СНК СССР і НКЮ СССР ад 5 кастрычніка 1944 г. № 486/47 у г. Мінску павінен быў аднавіць сваю працу Мінскі юрыдычны інстытут (МЮІ) НКЮ БССР. Дзеля хутчэйшага наладжвання яго працы Наркам юстыцыі СССР Н. Рычкоў 16 кастрычніка 1944 г. накіраваў намесніку старшыні СНК СССР В.М. Молатаву просьбу даць указанне Дзяржплану СССР запланаваць на IV квартал водпуск будаўнічых матэрыялаў і абсталявання Наркамату юстыцыі БССР для Мінскага юрыдычнага інстытута [1, арк. 7].

Яшчэ да гэтых актаў СНК БССР 20 верасня 1944 г. прыняў пастанову № 594 «О возобновлении деятельности Белорусского государственного юридического института в г. Минске». Заняткі павінны былі пачацца з 1 кастрычніка 1944 г. План набора на першы курс быў вызначаны ў 150 чалавек [2, арк. 1].

10 кастрычніка 1944 г. Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут абвясціў прыём студэнтаў на 1944/45 навучальны год на I–III курсы. Тэрмін навучання ўстанаўліваўся ў 4 гады. Абітурыенты павінны былі здаваць уступныя экзамены па гісторыі народаў СССР, Канстытуцыі СССР, рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), беларускую мову і геаграфію [3, арк. 9]. Адначасова інстытут арганізаваў падрыхтоўчыя курсы на 70 чалавек [4, арк. 30].

Па стану на 14 лістапада 1944 г. на I курсе лічыўся 151 чалавек, на II – 20, на III – 17. Усяго 188 студэнтаў, а па плану павінна было быць 240. З 188 чалавек 7 з'яўляліся членамі УКП(б) і кандыдатамі ў члены УКП(б), 53 – членамі ВЛКСМ; 24 – інвалідамі Вялікай Айчыннай вайны, 19 – партызанамі; па нацыянальнаму складу: 139 – беларусаў, 26 – яўрэяў, 23 – рускіх.

Ва ўмовах працягвання Другой сусветнай вайны, разрухі, асабліва ў сталіцы Беларусі, раскіданасці з-за гэтага ранейшых кадраў інстытута па розных франтах, а таксама па розных рэгіёнах краіны ў выніку эвакуацыі аб'ектыўна існавала праблема з прафесарска-выкладчыцкім складам. На 1 студзеня 1945 г. працавалі толькі 2 загадчыкі кафедраў, 2 дацэнты кафедры, 5 старшых выкладчыкаў [4, арк. 1]. Казаць пра навуковую дзейнасць у такіх умовах не прыходзілася.

На працягу першага вучэбнага года пасля вайны паступова складваўся выкладчыцкі калектыў. У канцы другога семестра 1944/45 навучальнага года дацэнт І.С. Андрэйчык стаў выкладаць грамадзянскае права і грамадзянскі працэс, дацэнт В.П. Юдзін – крыміналістыку, некваліфікаваны выкладчык Злавінскі – гісторыю дзяржавы і права СССР. З цягам часу да выкладання розных дысцыплін былі прыцягнуты Мірон Цолкавіч Баран, Лазар Абрамавіч Рудзіцкі, Рахіль Заліманаўна Ханіна, Рыгор Адамавіч Левін, Галер Маркавіч Ліўшыц, Любоў Самуілаўна Мінзурэнка, Павел Ісаакавіч Гаўзе, Гаўрыіл Аляксеевіч Павецьеў, Пётр Усцінавіч Грышановіч і інш. [4, арк. 78].

Для развіцця юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі важнае значэнне мела пастанова ЦК ВКП(б) ад 5 кастрычніка 1946 г. «О расширении и улучшении юридического образования в стране». У гэтым акце ЦК ВКП(б) устанаўлівалася, што юрыдычная адукацыя ў краіне пастаўлена нездавальняюча. Сярод юрыстаў мелася крайне мала кваліфікаваных



спецыялістаў, якія б мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю. Між тым, патрэба ў іх пасля вайны ў органах юстыцыі, суда і пракуратуры ўсё яшчэ не пакрывалася штогадовым выпускам юрыстаў. У цэлым шэрагу юрыдычных інстытутаў было вельмі мала высокакваліфікаванага прафесара-выкладчыцкага складу, таму і ўзровень вышэйшай юрыдычнай адукацыі заставаўся ўсё яшчэ нізкім.

Адзначалася, што запушчанай застаецца навукова-даследчая праца ў галіне юрыспрудэнцыі, асабліва па тэорыі дзяржавы і права, савецкаму дзяржаўнаму праву, міжнароднаму праву, гісторыі савецкай дзяржавы. У апошнія гады не выдадзены вучэбнікі па тэорыі дзяржавы і права, савецкаму дзяржаўнаму праву, усеагульнай гісторыі дзяржавы і права навейшага часу, гісторыі дзяржавы і права СССР, гісторыі палітычных вучэнняў. Падкрэслівалася, што ў галіне юрыспрудэнцыі адсутнічае навуковая крытыка. Навуковыя кадры рыхтуюцца марудна і недастаткова. Колькасць аспірантаў-юрыстаў у параўнанні з 1940 г. зменшылася ў тры разы.

Суровай крытыцы падвяргласся праца Міністэрства юстыцыі СССР і Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР, якія не прынялі неабходных мер да пашырэння і паляпшэння вышэйшай юрыдычнай адукацыі і не забяспечылі пэўнай якасці сярэдняй юрыдычнай адукацыі [5, с. 1].

Выконваючы гэту пастанову ЦК УКП(б) 18 лістапада 1946 г. загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР № 630 быў адноўлены пяцігадовы тэрмін навучання на філалагічных, эканамічных, юрыдычных і геаграфічных факультэтах універсітэтаў краіны [6, с. 117].

Пастанова ЦК ВКП(б) ад 5 кастрычніка 1946 г. дала штуршок да развіцця юрыдычнай навукі і ў БССР. З улікам яе патрабаванняў ужо на другі семестр 1945/46 навучальнага года ў МЮІ з'явіўся план навукова-даследчай працы. У прыватнасці, ён прадугледжваў, што Б.Я. Бабіцкі падрыхтуе працу на тэму: «Западническое направление в науке истории русского права», П.І. Гаўзе – «Суд по гражданским делам в деле ликвидации последствий оккупационного режима», Л.А. Рудзіцкі – «Возникновение Белорусской ССР как суверенной республики» і «О работе сельских Советов БССР» [7, арк. 8].

На чацвёрты год працы МЮІ практычна стаў паўнавартаснай вышэйшай юрыдычнай навучальнай установай. Па-першае, нарэшце больш-менш стабілізаваўся кадравы прафесарска-выкладчыцкі склад інстытута. Гэтаму садзейнічаў загад Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР ад 17 чэрвеня 1947 г. № 36. На 1947/48 навучальны год па інстытуту, згодна яму, зацверджана 39 штатных адзінак, з іх загадчыкаў кафедрамі – 9, прафесараў кафедры – 1, дацэнтаў кафедрамі – 10, старшых выкладчыкаў – 9, асістэнтаў – 3, выкладчыкаў – 7.

Такая наяўнасць кадраў дазволіла сфарміраваць 10 кафедраў: марксізму-ленінізму, палітычнай эканоміі, дзяржаўнага права, тэорыі дзяржавы і права, гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права, крымінальнага працэсу, замежных моў, ваенную. Недахоп іх быў галоўным чынам у тым, што яны былі малалікімі. У той жа час інстытут папоўніла плеяда кандыдатаў юрыдычных навук. Гэта Я.І. Вельдзін, І.І. Гарэлік, В.А. Дарогін, Я.М. Кульберг, Я.М. Семярыхін [8, арк. 3, 4, 27].

Па-другое, адносна вялікая колькасць кандыдатаў юрыдычных навук дазволіла па-новаму падыйсці да арганізацыі навукова-даследчай працы. У практыку інстытута стала ўваходзіць правядзенне навуковых канферэнцый [8, арк. 28].

Па-трэцяе, інстытут стаў выконваць план прыёму абітурыентаў на першы курс. У 1947/48 навучальным годзе пры плане набору ў 220 чалавек быў прыняты на І курс 221 чалавек, з іх 50 % удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, 1 – Герой Савецкага Саюза. На ІІ курс было пераведзена 206 чалавек, на ІІІ – 145, на IV – 149. Усяго навучаўся 521 студэнт.

Па-чацвёртае, паўнавартаснасць заключаецца і ў тым, што ў гэтым годзе адбыўся першы выпуск высокакваліфікаваных кадраў па спецыяльнасці «юрыст» для працы ва ўсіх органах юстыцыі і пракуратуры – 91 малады спецыяліст [2, арк. 5].

Наяўнасць высокакваліфікаваных навуковых кадраў юрыстаў у інстытуце дазволіла яму скарыстацца правам, атрыманым яшчэ ў 1945/46 навучальным годзе, мець сваю аспірантуру. У 1949/50 навучальным годзе ў яе было прынята 5 чалавек, а ўсяго мелася 7 аспірантаў: па кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права гэта былі Зімяніна, С.Г. Драбязка, Н.А. Кудзінаў; па кафедры крымінальнага права – І.С. Тышкевіч і П.К. Еўдакімаў, па кафедры крымінальнага працэсу – І.І. Марціновіч, па кафедры грамадзянскага права – В.Ф. Чыгір [9, арк. 95].

1947–1948 гг. у Савецкім Саюзе адзначаны вострымі дыскусіямі па розных галінах навукі. Характэрна, што як і ў даваенны перыяд яны папярэднічалі пачатку масавых рэпрэсій. Гэта атмасфера не магла не закрануць і калектывы юрыдычных інстытутаў і факультэтаў СССР, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі склад і студэнтаў МЮІ.

9 мая 1949 г. Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР выдала загад № 547 «О мерах по повышению идейно-теоретического уровня преподавания юридических наук в высшей школе». Коратка адзначыўшы поспехі ў гэтай справе, загад адзначыў «крупные недостатки», у тым ліку «серьезные политические ошибки» некаторых прафесараў і выкладчыкаў юрыдычных вну, у прыватнасці, кнігі прафесара Г.С. Гурвіча, у якіх ён імкнуўся «ревизовать основные положения марксистско-ленинской науки о государстве и праве, подменять их «теориями», заимствованными у буржуазных ученых, превозносил буржуазный конституционализм, не раскрывая его подлинно реакционное социально-политическое содержание» [10, арк. 102]. Крытыкавалі і прафесара І.Д. Левіна за яго працу «Суверенитет» (1948), у якой ён «извращает советскую концепцию суверенитета и пытается дать определение суверенитета, означающее по существу отрицание суверенитета малых стран и обоснование англо-американской захватнической политики». Не абойдзены быў крытыкай і акадэмік П.П. Трайнін, які ў вучэбніку па савецкай дзяржаве і праву пры вызначэнні сістэмы савецкага дзяржаўнага права «недооценил научное значение Советской Конституции», а таксама прафесары А.К. Стальгевіч, М.А. Аржанаў, А.А. Герцэнзон, К.А. Флейшыц, С.В. Юшкоў і інш. [10, арк. 103].

Як вынік усіх ідэйна-тэарэтычных разборак цэнтр вырашыў строга кантраляваць вучэбныя праграмы, асабліва па гуманітарных дысцыплінах. У сувязі з гэтым Галоўнае ўпраўленне юрыдычных вну Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР 15 ліпеня 1949 г. усклала (на 1949/50 навучальны год) падрыхтоўку вучэбных праграм па тэорыі дзяржавы і права на кафедру тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Маскоўскага юрыдычнага інстытута пад рэдакцыяй прафесара М.Р. Аляксандрава, па гісторыі дзяржавы і права СССР – на складальнікаў прафесара С.В. Юшкова і дацэнта І.Д. Мартысевіча, па гісторыі дзяржавы і права – на калектыў складальнікаў пад рэдакцыяй прафесара С.Ф. Кечэк'яна і так па савецкаму дзяржаўнаму праву, дзяржаўнаму праву краін народнай дэмакратыі, дзяржаўнаму праву буржуазных краін і г. д. [10, арк. 213].

Часопіс «Коммунист» (1952) адзначыў запушчанасць навукова-даследчай працы ў МЮІ, доўгую бясплоднасць намаганняў яго шэрагу супрацоўнікаў (дацэнтаў Волкава, Рудніцкага, Бабіцкага, Гаўзе і інш.). Аднак у справаздачы МЮІ адзначана, што за апошнія тры гады (1950–1953) вырасла праслойка кандыдатаў навук з 6 да 25 чалавек, а дацэнтаў – з 9 да 15 [11, арк. 4, 5, 7]. Кандыдацкія дысертацыі абаранілі і многія выпускнікі МЮІ, у прыватнасці, І.С. Тышкевіч, П.К. Еўдакімаў, В.А. Шкурко, В.С. Карпік. Прадставілі да абароны кандыдацкія дысертацыі В.Ф. Чыгір, Н.А. Кудзінаў, С.Г. Драбязка і І.І. Марціновіч. Прадаўжалі працаваць над навуковымі працамі 7 чалавек [12, арк. 208–210].

Як бачна, у МЮІ паступова складваўся прафесіянальны выкладчыцка-навуковы калектыў, які заклаў асновы для далейшага развіцця юрыдычнай навукі ў Беларусі. Гэту працу прадоўжыў юрыдычны факультэт БДУ, які быў утвораны на базе МЮІ. Апошні перадаў універсітэту 10 кафедраў, на якіх працавалі 20 дацэнтаў, 19 старшых выкладчыкаў [13, арк. 1–3, 5].

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР і ЦК КПСС ад 30 жніўня 1954 г. юрыдычныя факультэты ўніверсітэтаў сталі рыхтаваць студэнтаў па спецыяльнасці «Правазнаўства». Таму былі перагледжаны вучэбныя планы і вучэбныя праграмы па розных юрыдычных дысцыплінах. У адпаведнасці з новым вучэбным планам некаторыя прадметы былі выключаны з яго і адначасова ўведзены новыя: «Прокурорский надзор в СССР», «Советская судебная статистика» і інш. Асаблівая ўвага надавалася крымінальнаму, грамадзянскаму, грамадзянска-працэсуальнаму, працоўнаму, зямельнаму, калгаснаму і фінансаваму праву; лабараторным заняткам па крыміналістыцы; вытворчай практыцы. Вынікам вучобы студэнтаў павінны былі стаць залікі па 4 курсавых працах і прыкладна 4-5 экзаменаў у сесію. Значна былі пашыраны правы рэктараў ўніверсітэтаў, дэканаў, загадчыкаў кафедры ў вызначэнні штатаў выкладчыкаў, расстаноўкі навуковых кадраў.

Важным для разумення развіцця юрыдычнай навукі і адукацыі БССР, як і іншых савецкіх рэспублік, быў і Закон СССР ад 11 лютага 1957 г. «Об отнесении к ведению союзных республик законодательства об устройстве судов союзных республик, принятия Гражданского, Уголовного и Процессуальных кодексов» [14]. У выніку адмянялася ўведзеная Канстытуцыяй СССР 1936 г. празмерная цэнтралізацыя ў галіне правасуддзя, грамадзянскага, крымінальнага і працэсуальнага заканадаўства. Адначасова гэта дазволіла саюзным рэспублікам аднавіць сваё заканадаўства ў гэтых галінах права, улічваючы свае нацыянальныя і бытавыя асаблівасці. За Саюзам ССР зберагалася права ўстанаўлення асноў крымінальнага, грамадзянскага і працэсуальнага заканадаўства, а таксама заканадаўства ў галіне правасуддзя.

Менавіта ў гэтым напрамку адбываліся навукова-даследчыя напрацоўкі юрыдычнага факультэта БДУ імя У.І. Леніна. У 1960 г. да іх далучыліся і даследчыкі кафедры філасофіі і права Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі, арганізаванай на аснове загада № 747 Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльна і прафесіянальнай адукацыі ад 21 лістапада 1960 г. [15, арк. 180]. Пазней там была ўтворана самастойная кафедра савецкага права. З 16 мая 1958 г. у Мінску пачало працаваць аддзяленне факультэта завочнага навучання Вышэйшай школы МУС СССР. З 1 студзеня 1976 г. была ўтворана Мінская вышэйшая школа Міністэрства ўнутраных спраў СССР [16, арк. 69]. З 1 мая 1978 г. да гэтых юрыдычных устаноў далучылася аддзяленне правазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, на аснове якога ў 1981 г. быў сфарміраваны факультэт правазнаўства.

У гэты перыяд праведзена маштабная кадыфікацыя права на аснове прыняцця Асноў саюзнага заканадаўства і саюзных рэспублік па розных галінах права. Толькі ў 1958–1977 гг. было прынята пятнаццаць такіх Асноў. На іх аснове саюзныя рэспублікі прынялі свае кодэксы; у БССР – 11 кодэксаў (Крымінальны, Грамадзянскі, Зямельны, Водны і інш.). Невыпадкова, што толькі ў 1959 г. калектывы кафедраў юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы 7 праектаў заканадаўчых актаў: праекта закона аб судаўладкаванні Беларускай ССР, праектаў Крымінальнага кодэкса, Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, Грамадзянскага кодэкса, Грамадзянска-працэсуальнага кодэкса, КзоТ БССР і праекта Кодэкса аб шлюбе, сям'і і апецы [18, арк. 107]. Па пытаннях судаводства, крымінальна-прававой і грамадзянска-прававой навукі найперш і быў здзейснены сапраўдны прарыў у даследаваннях беларускіх вучоных.

Развіццё навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў свеце патрабавала адэкватных мер з боку кіраўніцтва СССР і саюзных рэспублік. Невыпадкова для актывізацыі якасці навуковых даследаванняў і павышэння прэстыжнасці прафесарска-выкладчыцкай дзейнасці мела пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 28 студзеня 1960 г. № 127 «О мерах улучшения качества диссертационных работ и порядка присуждения ученых степеней и званий». У гэтай пастанове прыцягвае ўвагу і сёння рашэнне аб прадастаўленні ВАКу права дазваляць саветам вну і навукова-даследчых устаноў прымаць да абароны на суісканне вучонай ступені кандыдата і доктара навук нароўні з дысертацыямі надрукаваныя працы, якія ўзбагацілі навуку і тэхніку новымі рашэннямі, адкрыццямі, а таксама найбольш буйныя вынаходніцтвы, якія маюць вялізнае народнагаспадарчае значэнне, укаранёныя ў вытворчасць, надрукаваныя і зарэгістраваныя Камітэтам па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў (п. 4).

Не менш важнае значэнне мела рашэнне дазволіць ВАКу па хадатайніцтву саветаў вну і навукова-даследчых устаноў прысвойваць, у парадку выключэння, вучоныя званні дацэнта або прафесара выкладчыкам вну, якія маюць вялізны стаж навукова-педагагічнай працы, надрукаваныя навуковыя працы і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, і чытаюць лекцыі на высокім навукова-метадычным узроўні з выкарыстаннем сучасных дасягненняў навукі і тэхнікі (п. 15) [19, арк. 1а–2а].

Характэрна, што ў БССР за 1950-я гг. лік навуковых работнікаў павялічыўся больш, чым у 2,5 раза і на 1960 г. дасягнуў 6 840 чалавек. З іх 181 мелі вучоную ступень доктара навук і 2 013 – кандыдата навук [20, арк. 72]. Нават толькі гэты факт сведчыць пра тое, якую ўвагу надавала дзяржава ў цэлым і рэспубліка ў прыватнасці справе развіцця навукі і тэхнікі. Далейшым клопатам аб паляпшэнні падрыхтоўкі навуковых

кадраў была прасякнута і пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 9 верасня 1961 г. № 545 «О мерах по улучшению подготовки научных и научно-педагогических кадров в Белорусской ССР». Па сутнасці, яна ў пэўнай ступені паўтарала пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 13 чэрвеня 1961 г. № 536 «О мерах по улучшению подготовки научных и научно-педагогических кадров». Пастанова дазваляла вну вызваляць ад педагагічнай работы кандыдатаў навук тэрмінам да двух гадоў, якія валодалі сур'ёзнымі даследчымі напрацоўкамі і адобраныя саветамі вну планы навуковай працы па важных народнагаспадарчых або тэарэтычных пытаннях, з пераводам іх у лік старшага або малодшага навуковага супрацоўніка, для падрыхтоўкі доктарскіх дысертацый. Аб выніках сваёй працы яны павінны былі прадстаўляць навуковую справаздачу (п. 5а).

Вну атрымалі права на камандзіраванне ў другія вну, навукова-даследчыя ўстановы сваіх супрацоўнікаў для выканання даследаванняў на тэрмін да шасці месяцаў са зберажэннем зарплаты. Ім аплачваўся кошт жылля, праезд, сутачныя, але не больш, чым на два месяцы (п. 5 б). Пэўную льготу атрымоўвалі і аспіранты-завочнікі, якія вызваляліся ад асноўнай працы на адзін дзень у тыдзень на працягу чатырох гадоў навучання, з аплатай яго ў памеры 50 % атрымоўваемай зарплаты (п. 5 г) [20, арк. 74].

Важным нарматыўным прававым актам, які аказаў уплыў на развіццё навукі і тэхнікі Беларусі, была пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 20 лютага 1964 г. № 163 «О дальнейшем развитии научно-исследовательской работы в высших учебных заведениях» [21, арк. 3]. У мэтах больш шырокага прыцягнення прафесарска-выкладчыцкага складу для выканання навукова-даследчых прац пастанова дазваляла штатнае сумяшчальніцтва выкладчыкам вну ў розных установах, выконваючых работы, звязаныя з развіццём найбольш важнейшых для народнай гаспадаркі галінах з выплатай да 50 % службовага акладу займаемай пасады. Сумяшчальніцтва дазвалялася толькі па адной пасадзе пры наяўнасці дазволу кіраўнікоў вну і зацікаўленных устаноў.

Непасрэдна на дальнейшае развіццё юрыдычнай навукі Беларусі мела пастанова ЦК КПСС ад 5 кастрычніка 1964 г. «О мерах по дальнейшему развитию юридической науки и улучшению юридического образования в стране». У ёй адзначана асаблівае значэнне права для пабудовы камуністычнага грамадства і адначасова вызначаны недахопы ў развіцці юрыдычнай навукі і адукацыі. У прыватнасці адзначалася, што нават сярод супрацоўнікаў органаў пракуратуры, судоў, адвакатуры многія не мелі вышэйшай юрыдычнай адукацыі, таму ЦК КПСС вызначыў пэўныя



меры па павелічэнню і паляпшэнню падрыхтоўкі юрыдычных кадраў; прапанаваў спецыялізацыю студэнтаў з улікам іх будучай працы; уключэнне ў вучэбныя планы такіх курсаў, як савецкае будаўніцтва, гаспадарчае права, судовая псіхалогія, выпраўленча-працоўнае права; патрабаваў арганізацыю спецыяльнай юрыдычнай падрыхтоўкі работнікаў савецкіх і гаспадарчых органаў, дзейнасць якіх непасрэдна звязана з прымяненнем заканадаўства; павышэння якасці навуковых прац, а таксама выдаваемых нарматыўных прававых актаў [22].

У цэлым 1960-я гг. характарызуюцца больш інтэнсіўным развіццём заканадаўства і тэорыі права. Пачынаючы з праекту хрушчоўскай адлігі ў грамадстве, найперш сярод прававедаў, пад уздзеяннем пэўнай разрадкі міжнароднай напружанасці, пазітыўных геапалітычных зменаў у свеце, больш шырокага абмену дэлегацыямі сацыялістычных і капіталістычных краін усё больш актыўна фарміруецца думка аб неабходнасці забяспечыць верхавенства права і закона, гарантыі правоў асобы. У большай ступені яна атрымала адлюстраванне ў праекце Канстытуцыі СССР 1964 г. і ў некаторай ступені – у саюзнай Канстытуцыі 1977 г., Канстытуцыі БССР 1978 г. Зроблена спроба некаторага размежавання заканадаўчай кампетэнцыі СССР і саюзных рэспублік, хоць і ў межах жорсткага прававога ўнітарызму.

Прынятыя пастановы саюзных і рэспубліканскіх органаў аказалі непасрэдны ўплыў на далейшае развіццё юрыдычнай навукі і адукацыі БССР. Дзякуючы ім БДУ імя У.І. Леніна з 1960 г. было прадастаўлена права прымаць да абароны доктарскія і кандыдацкія дысертацыі, прадстаўленне да зацвярджэння ў вучонай ступені доктара навук і прысуджэння на аснове абароны вучонай ступені кандыдата навук [19, арк. 13]. Такое ж права атрымаў Аб'яднаны савет Аддзялення грамадскіх навук АН БССР [19, арк. 19]. Станоўча паўплывала на развіццё юрыдычнай навукі арганізацыя ў 1968 г. пры БДУ імя У.І. Леніна выдавецтва (першапачаткова было ўтворана ў 1954 г., а затым ліквідавана) [23, арк. 95], а таксама часопіса «Вестник БГУ имени В.И. Ленина» (4 серыі па 3 нумары ў год кожнай серыі) [24, арк. 68].

Накіраванасць навуковай дзейнасці кафедраў юрыдычнага факультэта БДУ ў 1960-х гг. заставалася ранейшай. Прадаўжалася праца над дапаможнікамі і вучэбнікамі, кандыдацкімі і доктарскімі дысертацыямі, а таксама над палажэннямі і нормамі праектаў розных кодэксаў БССР, іншых нарматыўных прававых актаў. У працэсе працы над кодэксамі, асабліва над праектамі Крымінальнага і Крымінальна-працэсуальнага кодэксаў, узнік шэраг спрэчных пытанняў сярод даследчыкаў. Дзеля ўнясення ў іх большай яснасці былі выдадзены тры выпускі зборніка

артыкулаў «Вопросы уголовного права и процесса» (1958, 1959, 1960). У іх кожны з аўтараў выказаў свой пункт гледжання [25, арк. 69–70]. Безумоўна, што такі падыход дазволіў больш якасна падрыхтаваць названыя вышэй кодэксы.

У гэты перыяд адбылася адна з важнейшых падзей для гісторыі юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі. З 1963 г. дацэнт І.А. Юхо ўпершыню ў айчыннай юрыдычнай адукацыі стаў выкладаць для студэнтаў юрыдычнага факультэта БДУ новую вучэбную дысцыпліну – «Гісторыю дзяржавы і права Беларусі». Гэтым актам быў пакладзены пачатак як набыццю ведаў, уменняў і навыкаў па гісторыка-прававой навуцы Беларусі, што прыкметна павышала самасвядомасць студэнтаў, так і больш актыўнаму навуковаму даследаванню розных пытанняў дзяржаўнасці і права нашай Айчыны.

Актыўна працавалі і іншыя даследчыкі. Выконваючы абавязкі прафесара А.В. Дулаў паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Процессуальные проблемы судебной экспертизы» (1963), а дацэнт І.І. Гарэлік прадставіў да абароны доктарскую «Преступления, опасные для жизни и здоровья», надрукаваў манаграфію «Ответственность за оставление в опасности по советскому уголовному праву» (1960). Старшы навуковы супрацоўнік І.І. Марціновіч працавала над доктарскай «Развитие суда в БССР». Дацэнт І.С. Тышкевіч, апрача працы над доктарскай, закончыў манаграфію «Вопросы квалификации превышения пределов необходимой обороны», а дацэнт А.С. Фарфель, апрача работы над доктарскай «Борьба народных масс против контрреволюционной юстиции буржуазного Временного правительства», надрукаваў брашуру «Народные университеты правовых знаний». Выконваючы абавязкі дацэнта П.А. Дубавец пасля абароны кандыдацкай дысертацыі ў Інстытуце дзяржавы і права АН СССР у 1962 г. выдаў манаграфію «Ответственность за телесные повреждения по советскому уголовному праву» (1964) [21, арк. 129–132].

Пэўны ўнёсак здзейснілі і вучоныя-юрысты Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (БІНГ) у 1966 г.: кандыдат юрыдычных навук А.Г. Новікаў падрыхтаваў манаграфію «Правовое положение межколхозных строительных организаций», дацэнт М.М. Авакаў – манаграфію «Основные проблемы правопреемства в международном праве», а прафесар М.М. Браганскі – манаграфію «Общее учение о хозяйственных договорах» [26, арк. 118–119]. Для малалікай кафедры БІНГ, якая пачала сваю дзейнасць толькі з канца 1960 г. і называлася першапачаткова кафедрай філасофіі і права, гэта выдатны паказчык [27, арк. 180].

У цэлым 1960-я гг. сталі пэўным уздымам развіцця юрыдычнай навукі Беларусі. Упершыню менавіта ў гэты час шэраг кандыдатаў юрыдычных навук, дацэнтаў паспяхова абаранілі свае доктарскія дысертацыі. Гэта А.В. Дулаў, Ф.І. Гаўзе, І.І. Гарэлік, С.В. Курылёў, І.І. Марціновіч, М.Р. Юркевіч, І.С. Тышкевіч з БДУ імя У.І. Леніна, С.П. Маргунскі з Інстытута філасофіі і права, М.І. Брагінскі, К.П. Уржынскі і М.М. Авакаў з Беларускага інстытута народнай гаспадаркі, Л.В. Багрый-Шахматаў з Мінскай вышэйшай школы МУС СССР.



Такім чынам, выкладзены матэрыял дазваляе заключыць, што ў 1940–1960-х гг. дзякуючы зацікаўленасці Савецкай улады юрыдычная навука Беларусі пачала пасля вайны паспяхова аднаўляцца, атрымала далейшае плённае развіццё. Калі першапачаткова навуковую юрыдычную дзейнасць распачаў МЮІ, то ў 1960-х гг. – цэлы шэраг вышэйшых навучальных устаноў, хоць галоўную ролю адыгрываў юрыдычны факультэт БДУ, а таксама навуковыя ўстановы. Калі 1940–1950-я гг. былі часам фарміравання навуковых даследаванняў, што вылілася, у прыватнасці, у абарону кандыдацкіх дысертацый, то ў 1960-я гг. – пэўны ўздым юрыдычнай навукі Беларусі, што праявілася і ў з'яўленні першых доктарскіх дысертацый па юрыспрудэнцыі.

Характэрна, што навуковыя працы, напісаныя ў савецкі перыяд гісторыі, зыходзілі найперш з тых асноватворчых установак Камуністычнай партыі і кіраўніцтва Савецкага Саюза, нормаў і палажэнняў заканадаўства СССР і Беларускай ССР. З пазіцый цяперашняй навукі і тых магчымасцей, якія адкрыліся перад вучонымі ў Рэспубліцы Беларусь, у гэтых працах ёсць і пралікі, пэўныя недахопы. У той жа час яны багатыя на фактычны матэрыял, які і сёння можна карысна выкарыстоўваць, на метадалагічныя падыходы, прыёмы раскрыцця і тлумачэння тых ці іншых нормаў права, напісаныя на дастаткова высокім навуковым узроўні.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 3.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 1.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 5.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 2.
5. Выше качество юридического образования // Социалист. законность. – 1949. – № 9. – С. 1–3.
6. Мовшович, М.И. Высшая школа. Основные постановления, приказы и инструкции (по материалам на 1-е июля 1947 г.) / М.И. Мовшович. – М. : Совет. наука, 1948. – 616 с.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 12.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 28.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 28.

10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 44.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 160.
12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 63.
13. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1110. – Воп. 1. – Спр. 236.
14. Ведомости Верховного Совета СССР. – 1957. – № 4. – Ст. 63.
15. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 51.
16. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4. – Воп. 133. – Спр. 35.
17. Сільчанка, М.У. Юридический факультет ГрГУ имени Янки Купалы / М.У. Сільчанка // Юридический факультет. – Режим доступа: http://www.lf.grsu.by/index.php?option=com_content. – Дата доступа: 07.03.2018.
18. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 5.
19. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 45.
20. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 129.
21. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 606.
22. Постановление ЦК КПСС «О мерах по дальнейшему развитию юридической науки и улучшению юридического образования в стране» – программа деятельности юридических вузов страны // Правоведение. – Л. : Изд-во Ленингр. ун-та, 1965. – № 1. – С. 188–192.
23. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 1015.
24. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 1277.
25. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 57.
26. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 968.
27. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1220. – Воп. 1. – Спр. 51.

УДК 340

***А.В. Григорьев***

## СОВЕТСКАЯ ЮРИДИЧЕСКАЯ НАУКА О ТЕОРИИ ПРАВОВОГО ГОСУДАРСТВА

В результате революционных событий 1917 г. произошли коренные преобразования во всех сферах общественной жизни. В юриспруденции на смену методологическому плюрализму приходит диктат марксистской классовой теории, не допускавшей альтернативных подходов и политико-правовых концепций. В этих условиях многообразие политико-правовой мысли отрицается советской юридической методологией. В результате основные направления в теории права дореволюционного периода (историческая школа права, юридический позитивизм, социологическая юриспруденция, психологическая школа права и др.) подвергались критике за игнорирование классового начала, непонимание классовой сущности государственно-правовых явлений. Некоторые теоретические наработки предшествующего периода не были восприняты советским правоведением, так как оценивались с классовых позиций и объявлялись «буржуазными». К их числу следует отнести и теорию правового государства.



В отличие от теории правового государства в марксистской доктрине государство выступало органом насилия, служащим интересам только экономически и политически господствующего класса, и совершенно по-иному, с классовых позиций, трактовались понятия «законность», «народ», «социальная справедливость», «свобода» и др. Следовательно, созданное государство стало орудием подавления политических противников Советской власти, орудием подавления инакомыслия. Руководители государства, объединив в руках партии рычаги всех ветвей власти, совершали без учета специфики социально-экономических условий внеправовые эксперименты – от насильственной коллективизации сельского хозяйства и массового переселения народов до безжалостного уничтожения неугодных режиму лиц [1, с. 114]. Можно утверждать, что в силу ряда объективных и субъективных причин вместо диктатуры пролетариата в стране установилась диктатура партийно-государственного аппарата.

В этой связи теория правового государства (как государства, связанного правом) была объявлена буржуазной лженаукой, используемой идейными противниками коммунизма в пропагандистских и подрывных целях. Такое официальное отношение к доктрине правового государства впервые было сформулировано в докладе известного деятеля большевистской партии и советского правительства Л.М. Кагановича, который, критикуя определение советской республики как государства правового, осуществляющего свою деятельность в условиях правового режима, заявил: «Вряд ли нужно доказывать всю путанность и вредность этой немарксистской формулировки т. Малицкого. Ведь мы отвергаем понятие правового государства даже для буржуазного государства. Как марксисты, мы считаем, что буржуазное государство, прикрываемое формой права, закона, демократии, формального равенства, по сути дела есть не что иное, как буржуазная диктатура. Понятие „правовое государство“ изобретено буржуазными учеными для того, чтобы скрыть классовую природу буржуазного государства» [2, с. 9]. В результате сторонники этой теории подвергались политическим преследованиям, а основные ее положения либо категорически отвергались, либо искажались в угоду политическому произволу.

С точки зрения классового подхода рассматривались и многие другие доктринальные положения теории государства и права. Так, на совещании Института права АН СССР по вопросам науки советского государства и права (16–19 июля 1938 г.) было одобрено определение права: «Право – совокупность правил поведения, выражающих волю господствующего